

# ЛІСТЫ ДА ЦЁТКІ

## З XXI СТАГОДДЗЯ

## ГРАМАДСКА-ЛІТАРАТУРНАЯ АКЦЫЯ, ПРЫСВЕЧАНАЯ 145-Й ГАДАВІНЕ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ ЦЁТКІ

У 2021 годзе культурная грамадскасць Беларусі адзначае 145-ю гадавіну з дня нараджэння нашай славутай зямлячкі, класіка беларускай літаратуры, паэтэсы-дэмакраткі Алаізы Пашкевіч (Цёткі). З гэтай нагоды Гродзенскае абласное аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі абвяшчае абласную грамадска-літаратурную інтэрнэт-акцыю **«Лісты да Цёткі з XXI стагоддзя».**

Да ўдзелу ў акцыі прымаюцца апублікаваныя **відэаролікі** працягласцю да 5 хвілін. Узрост аўтараў відэа не абмежаваны. Зместам відэаролікаў могуць быць: буктрэйлеры, выступленні чытальнікаў, натхнёныя словам паэтэсы лірычныя відэазамалёўкі, а таксама водгукі аб прачытаных творах Цёткі (Алаізы Пашкевіч), аналітычныя развažанні. Ідэя, якая павінна аб’ядноўваць выступленні ўдзельнікаў акцыі, – сувязь часоў праз творчасць Цёткі, яе вобраз у мінулым і ў сучасным свеце. Спасылкі на апублікаваныя відэа **з паметкай «Лісты да Цёткі» і з указаннем свайго імя, прозвішча, месца пражывання і роду заняткаў**, калі ласка, дасылайце на адрас электроннай пошты Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі:

**postmaster@pisateli.by**

Дасланыя працы будуць публікавацца ў сацыяльных сетках і на сайце Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі:

**www.pisateli.by**

Грамадска-літаратурная акцыя **«Лісты да Цёткі з XXI стагоддзя»** стартуе з моманту апублікавання дадзенай аб'явы і працягнецца да 5 лютага 2022 года (дня памяці беларускай паэтэсы са Шчучыншчыны). Шаноўныя сябры, чакаем вашы відэалісты да неўміручага вобразу Цёткі. Таксама будзем вельмі ўдзячныя за **дыскусіі**, за вашы **каментары і водгукі** на творчыя працы ўдзельнікаў акцыі.

Створаны па выніках акцыі відэаархіў будзе перададзены ў Музей А.С.Пашкевіч (Цёткі) у аграгарадку Астрына Шчучынскага раёна.

**З павагай,**
**Саюз пісьменнікаў Беларусі,**
**Гродна**

